**Храпавіцкая, Н.** Час выбраў нас / Наталля Храпавіцкая // Лепельскі край. — 2022. — 15 лют. — С. 3.

# ЧАС ВЫБРАЎ НАС

**У Лёзне адбыўся рэгіянальны конкурс-фестываль афганскай і патрыятычнай песні і паэзіі «Час выбраў нас», прысвечаны Году гістарычнай памяці. Штогод на мерапрыемстве збіраюцца людзі, каму неабыякавая тэма вайны, і лёсы тых, хто выконваў свой баявы абавязак.**



Жыхары Лепельшчыны таксама не засталіся ўбаку ад важнай падзеі, тым больш напярэдадні Дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Дэлегацыя з нашага раёна ў складзе 5 чалавек прыняла актыўны ўдзел у мерапрыемстве

Артысты сваім эмацыянальным, кранальным выкананнем выклікалі ў гледачоў незабыўныя ўражанні і падарылі сапраўднае свята.

На членаў журы была ўскладзена нялёгкая задача – выбраць лепшых. Прыемна адзначыць, што сярод пераможцаў аказаўся і лепяльчанін Ігар Вішнеўскі.

Напярэдадні памятнай даты хочацца нагадаць, што Ігар быў прызваны ў шэрагі Савецкай арміі Ленінскім РВК горада Фрунзе 10 мая 1984 года. У Афганістане знаходзіўся з 25 сакавіка 1985-га па 5 мая 1986 года.

Нарадзіўся мужчына ў 1965 годзе ў горадзе Фрунзе (Кіргізія). Пасля заканчэння васьмігодкі паступіў у Фрунзенскі машынабудаўнічы тэхнікум, дзе атрымаў прафесію тэхніка-тэхнолага. З дыпломам на руках хлопец накіраваўся на завод у якасці токара. Працаваў на станку з лічбавым праграмным кіраваннем, але доўга не затрымаўся. Праз некалькі месяцаў быў прызваны на службу ў войска.

Ля Алма-Аты ёсць горад Капчагай, дзе навабранец і праходзіў службу першыя 10 месяцаў. А потым усю часць адправілі ў правінцыю Гільменд, што недалёка ад Кандагара Рэспублікі Афганістан.

Размяшчалася часць у пустыні. Спачатку жылі ў палатках, а потым самастойна ўзводзілі вялікія казармы з распаўсюджанага ў тых мясцінах будаўнічага матэрыялу – саломы і гліны.

На аўтамабілі «Урал» хлопец забяспечваў ваеннаслужачых прадуктамі і ўсім неабходным.

Бацькі ведалі, дзе праходзіць службу іх сын, але ў сваіх лістах радавы Ігар Вішнеўскі падрабязнасцяў не распавядаў.

Сярод саслужыўцаў былі хлопцы розных нацыянальнасцяў, і з усімі малады салдат меў таварыскія адносіны. А там па-іншаму было нельга.

Ігару давялося ўбачыць і смерць саслужыўцаў. Таму, напэўна, пра вайну ён імкнецца не ўспамінаць.

Усё сваё жыццё мужчына сябруе з музыкай, не можа без гітары правесці і дня. Разам з хлопцамі на службе яны здолелі зрабіць гітару нават са скрыні з-пад патронаў. «Толькі б грыф і струны былі, а астатняе можна і самому змайстраваць», – лічыць Ігар.

У1986 годзе хлопец вярнуўся са службы.

Зараз Ігар Вішнеўскі працуе ў раённым Доме культуры. Выступае на сцэне і дорыць добры настрой жыхарам Лепельскага і суседніх раёнаў.

Тэкст і фота: **Наталля Храпавіцкая**